3. Што ўваходзіць у ваенную арганізацыю дзяржавы?
4. Назавіце дзяржавы — члены АДКБ і мэты арганізацыі АДКБ.
5. Вызначце асноўныя прыярытэтныя напрамкі ў кааліцыйнай ваеннай палітыцы Рэспублікі Беларусь.

## § 8. Абарона Рэспублікі Беларусь — святы абавязак кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь

*Што такое Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь? Што такое грамадзянства? Прывядзіце прыклады подзвігаў ураджэнцаў Беларусі пры абароне Айчыны.*

**Патрыятызм як аснова свядомых адносін грамадзян да абароны дзяржавы.** У сучасным свеце пад патрыятызмам разумеецца маральны і палітычны прынцып, сацыяльнае пачуццё, сэнсам якога з'яўляецца любоў да сваёй Айчыны, адданасць ёй, гонар за яе здзяйсненні, імкненне служыць яе інтарэсам і гатоўнасць абараняць яе.

Слова «патрыятызм» утварылася ад грэч. patrixtes — суайчыннік, patris — Радзіма, Айчына.

У патрыятызме гарманічна спалучаюцца *любоў да сваёй Айчыны* і *адданасць ёй*, гэта значыць імкненне сваімі дзеяннямі служыць інтарэсам Айчыны, абараняць яе ад ворагаў. Гэтыя рысы нацыянальнага характару беларусаў — патрыятызм і свабодалюбства — фарміраваліся на працягу многіх стагоддзяў і заўсёды жылі і жывуць у сэрцах беларусаў, пабуджаючы іх усімі сіламі клапаціцца аб працвітанні і бяспецы сваёй Радзімы. З гэтымі пачуццямі звязаны і многія іншыя — адвага, мужнасць, гераізм, самаахвярнасць. Ва ўсе часы пачуццё патрыятызму натхняла людзей на подзвігі, апявалася ў лепшых мастацкіх творах.

Стрыжнем, асновай, найвышэйшай праявай патрыятызму з'яўляецца гатоўнасць і здольнасць у гады цяжкіх выпрабаванняў абараніць сваю Радзіму. Найбольш яскрава патрыятызм беларускага народа праявіўся ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны.

Гісторыя даказала: перамагае той, хто гатовы ісці да канца і ахвяраваць усім. Тыя, хто ўзнімаўся ў атаку, не думалі ні пра ўзнагароды, ні пра славу. І ні ў каго з іх не ўзнікла сумненняў, ніхто не задаў сабе пытання: а можа, мая ахвяра не патрэбна? Яны проста ведалі: няма ў жыцці нічога даражэйшага за Радзіму. І верылі: дарэмных ахвяр у імя Айчыны не бывае. Аддаючы сваё жыццё, яны пакідалі нам сваю

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

веру. Гэта вера, гэта гатоўнасць скласці галаву за Айчыну і сёння жывуць у нашым народзе.

Памяць пра гераічнае мінулае нашых продкаў служыць для сучасных пакаленняў невычэрпнай крыніцай любові да сваёй Айчыны, гонару за яе дасягненні, імкнення абараняць Радзіму, унесці ўласны ўклад у працвітанне сваёй краіны, свайго народа.

Сёння тэрміновая ваенная служба і служба ў рэзерве, навучанне ў ваенных навучальных установах або на ваенных факультэтах і кафедрах у ВНУ спалучаюць у сабе маральную, фізічную, прафесійную падрыхтоўку абаронцаў. Менавіта Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні сёння з'яўляюцца адной з асноўных сіл, якія служаць умацаванню ў грамадстве патрыятызму, гатоўнасці абараняць Айчыну, а ваенная служба — гэта, у першую чаргу, магчымасць для нашых грамадзян навучыцца абараняць сябе, сваю сям'ю, сваю Радзіму.

*Чаму ў Рэспубліцы Беларусь недапушчальна адмовіцца ад змешанага прынцыпу камплектавання Узброеных Сіл і перайсці толькі на кантрактную службу?*

Пачуццё патрыятызму з'яўляецца асновай свядомых адносін грамадзян да абароны дзяржавы. І гэта пачуццё не проста напаўняе гонарам за Рэспубліку Беларусь, а вымушае адказна ставіцца да самога сябе як часткі свайго роду, сваёй сям'і і краіны.

**Прававыя асновы ваеннай службы.** Законам Рэспублікі Беларусь «Аб абароне» вызначана, што святым абавязкам кожнага грамадзяніна з'яўляецца не проста ўдзел у забеспячэнні абароны, а ў абароне сваёй Радзімы.

Агульнанацыянальны падыход да абароны дзяржавы выкладзены ў артыкуле 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: «Абарона Рэспублікі Беларусь — абавязак і свяшчэнны доўг грамадзяніна Рэспублікі Беларусь». Ён жа вызначае, што «парадак праходжання воінскай службы, падставы і ўмовы вызвалення ад воінскай службы або замена яе альтэрнатыўнай вызначаюцца законам».

Воінскі абавязак і воінская служба грамадзян устанаўліваюцца з мэтай падрыхтоўкі насельніцтва да абароны дзяржавы, забеспячэння камплектавання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і іншых воінскіх фарміраванняў.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

*Чым з'яўляецца воінская служба для грамадзян Беларусі?*

Гісторыя сведчыць, што арміі выйграюць або прайграюць бітвы, а ў войнах перамагаюць толькі народы. Абарона Рэспублікі Беларусь належыць да найважнейшых функцый дзяржавы і з'яўляецца справай усіх грамадзян Рэспублікі Беларусь.

**Воінскі абавязак** — абавязак грамадзян Рэспублікі Беларусь, устаноўлены з мэтай стварэння і пастаяннага функцыянавання сістэмы мерапрыемстваў, што забяспечваюць абарону Рэспублікі Беларусь, праходжанне грамадзянамі воінскай службы, падрыхтоўку ваеннаабавязаных да ўзброенай абароны дзяржавы (мал. 37).



Мал. 37. Ваеннаслужачы Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

Юрыдычнай асновай воінскага абавязку з'яўляецца Закон «Аб воінскім абавязку і воінскай службе», які рэгулюе грамадскія адносіны ў сферы выканання грамадзянамі воінскага абавязку, такія як: воінскі ўлік, абавязковая падрыхтоўка да ваеннай службы, прызыў на ваенную службу, праходжанне ваеннай службы па прызыве, прызыў на службу ў рэзерве і праходжанне службы ў рэзерве, знаходжанне ў запасе, прызыў на ваенныя і спецыяльныя зборы і іх праходжанне.

У перыяды мабілізацыі, ваеннага становішча, у ваенны час выкананне грамадзянамі воінскага абавязку прадугледжвае прызыў на ваенную службу па мабілізацыі і яе праходжанне ў адпаведнасці з названым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяне маюць права праходзіць добраахвотную падрыхтоўку да ваеннай службы і выконваць канстытуцыйны абавязак па абароне Рэспублікі Беларусь шляхам добраахвотнага паступлення на ваенную службу.

Воінскі абавязак выконваюць грамадзяне мужчынскага полу, годныя па стане здароўя і фізічным развіцці да яе выканання, незалежна ад паходжання, сацыяльнага і маёмаснага стану, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, адукацыі, мовы, стаўлення да рэлігіі, роду і характару заняткаў, палітычных і іншых перакананняў, а таксама грамадзяне жаночага полу, якія адпавядаюць устаноўленым патраба-

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

ванням і прайшлі падрыхтоўку па спецыяльнасцях, неабходных для Узброеных Сіл і іншых воінскіх фарміраванняў.

Грамадзяне, якія ў адпаведнасці з Законам абавязаны выконваць воінскі абавязак, падраздзяляюцца на дапрызыўнікоў, прызыўнікоў, ваеннаслужачых, рэзервістаў, ваеннаабавязаных (мал. 38).

У нашай краіне ваенная служба — гэта магчымасць для кожнага грамадзяніна навучыцца абараняць сябе і забяспечваць абарону краіны.




Мал. 38. Катэгорыі грамадзян, якія абавязаны выконваць воінскі абавязак

**Прыпіска да прызыўных участкаў і прызыў на ваенную службу, службу ў рэзерве.** Выкананне воінскага абавязку, якое пачынаецца з прыпіскі грамадзян да прызыўных участкаў, ажыццяўляецца камісіямі, што ствараюцца раённымі, раённымі ў гарадах, гарадскімі (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Грамадзяне, якія дасягнулі ўзросту 16 гадоў і падлягаюць прыпісцы да прызыўных участкаў, абавязаны прыбыць у ваенныя камісарыяты (адасобленыя падраздзяленні) або на прызыўныя пункты ў тэрміны, указаныя ў павестках ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення) або іншага органа, што ажыццяўляе воінскі ўлік, і прад'явіць неабходныя дакументы. Пералік гэтых дакументаў указваецца ў павестках ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення) або

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

іншага органа, што ажыццяўляе воінскі ўлік. Адначасова юнакі праходзяць медыцынскую камісію.

Грамадзяніну, прыпісанаму да прызыўнога ўчастка, выдаецца пасведчанне прызыўніка, растлумачваюцца правы і абавязкі прызыўніка, правілы воінскага ўліку і парадак праходжання абавязковай падрыхтоўкі да ваеннай службы.

**Правы, абавязкі і адказнасць прызыўніка.** Грамадзяне, якія не з'явіліся без уважлівых прычын на месца і ў тэрмін, указаныя ў павестках або накіраваннях ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення) або іншага органа, што ажыццяўляе воінскі ўлік, парушылі абавязкі па воінскім уліку, ухіляюцца ад мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу, або ад яўкі на зборы ці занятκі і вучэбныя зборы, або ад воінскага ўліку ці адмовіліся ад атрымання павестак або накіраванняў ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення) або іншага органа, што ажыццяўляе воінскі ўлік, прыцягваюцца да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь (мал. 39).




Мал. 39. Уважлівыя прычыны няяўкі грамадзяніна па павестцы

Прычыны няяўкі павінны быць пацверджаны дакументамі адпаведных органаў. У выпадку іх адсутнасці грамадзянін можа быць прыцягнуты да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці.

1. Што такое патрыятызм у вашым разуменні?
2. Што разумеецца пад свядомымі адносінамі грамадзян да ўзброенай абароны Айчыны?

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

3. Што азначае тэрмін «грамадзянін Рэспублікі Беларусь»?
4. Чаму абарона Айчыны з'яўляецца пачэсным абавязкам?
5. З якой мэтай устанаўліваецца воінскі абавязак?
6. Які дакумент з'яўляецца юрыдычнай асновай воінскага абавязку?
7. Хто, у адпаведнасці з законам, выконвае воінскі абавязак?
8. Укажыце катэгорыю асоб, на якіх воінскі абавязак не распаўсюджваецца.
9. З якога ўзросту грамадзяне падлягаюць прыпісцы да прызыўных участкаў?
10. Навучэнец А. атрымаў павестку з ваеннага камісарыята, але не з'явіўся ў прызначаны час, паколькі святкаваў дзень нараджэння. Ці будзе гэта лічыцца ўважлівай прычынай няяўкі?
11. Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Мая сям'я (род, сваяк) у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, забеспячэнні ваеннай бяспекі дзяржавы».

## § 9. Законы Рэспублікі Беларусь «Аб воінскім абавязку і воінскай службе» і «Аб статусе ваеннаслужачых»

*Што такое закон? Як называецца вышэйшы заканадаўчы орган Рэспублікі Беларусь? Што такое прававая дзяржава і якое значэнне выканання закону ў дзяржаве?*

**Воінская служба.** Воінская служба — асобы від дзяржаўнай службы, якая ўключае праходжанне ваеннай службы або службы ў рэзерве, ваенных ці спецыяльных збораў у перыяд знаходжання ў запасе Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Заканадаўствам (мал. 40) устанаўліваецца прыярытэт воінскай службы перад іншымі відамі дзяржаўнай службы і працоўнай дзейнасці, якія выяўляецца ў спыненні грамадзянамі работы, вучобы і ін-




Мал. 40. Дакументы, якія вызначаюць статус ваеннаслужачага

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

шай дзейнасці пры прызыве або добраахвотным паступленні на ваенную службу, прызыве на службу ў рэзерве, на зборы, а таксама ў павышаным узроўні сацыяльнай абароненасці грамадзян, якія праходзяць ваенную службу, службу ў рэзерве (мал. 41).




Мал. 41. Віды воінскай службы

Ваеннаслужачым у Рэспубліцы Беларусь прызнаецца грамадзянін, які праходзіць ваенную службу ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, органах пагранічнай службы, унутраных і іншых войсках, воінскіх фарміраваннях і органах. Непасрэднае выкананне грамадзянамі воінскага абавязку заключаецца ў праходжанні ваеннай службы ў складзе Узброеных Сіл і іншых воінскіх фарміраванняў.

**Парадак праходжання тэрміновай ваеннай службы.** Тэрмін ваеннай службы па прызыве для ваеннаслужачых, якія не маюць вышэйшай адукацыі, складае 18 месяцаў, а для тых, хто мае вышэйшую адукацыю, — 12 месяцаў. Ваеннаслужачыя, якія прайшлі навучанне на ваенных кафедрах ці ваенных факультэтах па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і здалі ўстаноўленыя праграмамі падрыхтоўкі экзамены, праходзяць тэрміновую ваенную службу на працягу 6 месяцаў (мал. 42, 43).

Ваеннаслужачыя і рэзервісты, упершыню прызваныя (паступіўшыя) на ваенную службу, службу ў рэзерве, або грамадзяне, якія не праходзілі ваенную службу, службу ў рэзерве і ўпершыню прызваныя на зборы, а таксама грамадзяне, якія навучаюцца на ваенных

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки




Мал. 42. Праходжанне ваеннай службы




Мал. 43. Тэрміны, не залічаныя ў тэрмін ваеннай службы

кафедрах ці ваенных факультэтах па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і афіцэраў запасу, прыносяць перад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь і Баявым Сцягам воінскай часці Ваенную прысягу.

Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, за ўвесь перыяд ваеннай службы даецца адпачынак: салдатам — 10 сутак; сяржантам і старшынам — 15 сутак (тым, хто праходзіць тэрміновую ваенную службу 12 месяцаў, — 5 і 10 сутак адпаведна).

Працягласць адпачынку за ўвесь перыяд ваеннай службы ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, можа быць павялічана (у выглядзе заахвочвання) на тэрмін да 10 сутак у парадку, устаноўленым Дысцыплінарным статутам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

За здзяйсненне дысцыплінарных правіннасцей ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, у парадку, устаноўленым Дысцыплінарным статутам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, працягласць адпачынку можа быць зменшана.

Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу 6 месяцаў, адпачынак не прадастаўляецца.

Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, можа таксама давацца адпачынак па хваробе і па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару.

Ваеннаслужачы, які прайшоў тэрміновую ваенную службу, падлягае звальненню ў запас (мал. 44).




Мал. 44. Падставы для звальнення ў запас ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу

Ваеннаслужачыя пры выкананні абавязкаў ваеннай службы з'яўляюцца прадстаўнікамі дзяржаўнай улады і знаходзяцца пад аховай дзяржавы (мал. 45).

**Асобы прыярытэт — службе па кантракце.** У маладых людзей можа ўзнікнуць пытанне: чым вабіць грамадзян ваенная служба па кантракце? У грамадстве існуе думка, што па кантракце ідуць служыць людзі, якія не маюць адукацыі, не знайшлі сябе ў грамадзянскім жыцці. Гэта не так. На ўзбраенне беларускай арміі паступаюць усё больш сучасныя, складаныя комплексы ўзбраення і тэхнікі, якія патрабуюць глыбокіх ведаў і навыкаў. Без кваліфікаваных спецыялістаў яны будуць не эфектыўныя.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

ПЕРАВАГІ ДЛЯ АСОБ, ЯКІЯ ПРАЙШЛІ СЛУЖБУ Ў АРМІІ

- Абавязковае дзяржаўнае страхаванне на час праходжання службы
- Захаванне працоўнага месца ў дзяржаўных установах пасля службы
- Працаўладкаванне не пазней за двухмесячны тэрмін з дня звяртання жонак, чые мужы прызваны на тэрміновую ваенную службу
- Дзецям ваеннаслужачых гарантуецца прадастаўленне месцаў у дзіцячых садках на працягу трох месяцаў з дня падачы заявы
- Выплата матэрыяльнай дапамогі пры вяртанні на ранейшае месца працы пасля праходжання тэрміновай ваеннай службы
- У тэрмін абавязковай працы па размеркаванні па жаданні выпускніка залічваецца перыяд ваеннай службы па прызыве
- Адтэрміноўка пагашэння крэдыту на будаўніцтва жылля на перыяд службы
- Ільготы пры паступленні ва ўстановы адукацыі
- Вызваленне ад спагнання сродкаў, затрачаных на навучанне, пры добраахвотным паступленні на ваенную службу ва Узброеныя Сілы для выпускнікоў, якім месца працы прадастаўляецца шляхам размеркавання

Мал. 45. Перавагі для асоб, якія прайшлі службу ў арміі

Прычына росту папулярнасці ваеннай службы па кантракце — у высокім грамадскім статусе, важкім сацыяльным пакеце, перспектывах зрабіць паспяховую кар'еру.

Прывядзём некалькі аргументаў, якія могуць адыграць вырашальную ролю пры выбары грамадзянінам ваеннай службы па кантракце ў якасці прэстыжнай прафесіі:

— годная заработная плата, канкурэнтная на айчынным рынку працы;

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

— будаўніцтва жылля, грашовая кампенсацыя за арэнду кватэры;
— бясплатнае забеспячэнне рэчавай маёмасцю, харчовае забеспячэнне;
— бясплатнае высокакваліфікаванае медыцынскае абслугоўванне ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў, санаторна-курортнае лячэнне;
— магчымасць ваеннай службы па кантракце замест тэрміновай ваеннай службы;
— магчымасць руху па службе, прызначэння на вышэйшыя пасады па выніках службовай дзейнасці і ўзроўню адукацыі; павышэнне ўзроўню адукацыі за кошт бюджэтных сродкаў;
— насычаная цікавая баявая падрыхтоўка;
— права на пенсію па выслузе гадоў для ваеннаслужачых, якія праходзяць службу па кантракце;
— рэгламент службовага часу і аплачаныя адпачынкі;
— даступнасць.

Інфармацыю аб асаблівасцях праходжання ваеннай службы па кантракце можна атрымаць на афіцыйным інтэрнэт-партале Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь: www.mil.by.

1. Чым адрозніваецца воінская служба ад іншых відаў дзяржаўнай службы?
2. Назавіце заканадаўчыя акты, якія вызначаюць статус ваеннаслужачага.
3. Ахарактарызуйце асноўныя віды воінскай службы.
4. Ад чаго залежыць працягласць ваеннай службы па прызыве?
5. У якіх выпадках ваеннаслужачы можа быць звольнены ў запас?

## § 10. Абавязковая і добраахвотная падрыхтоўка грамадзян да ваеннай службы

*Якую ролю ва ўмацаванні абароны СССР адыграла ў перадваенныя гады арганізацыя Асаавіяхім (Таварыства садзейнічання абароне, авіяцыйнаму і хімічнаму будаўніцтву)?*

**Абавязковая і добраахвотная падрыхтоўка грамадзян да ваеннай службы.** У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб воінскім абавязку і воінскай службе» для грамадзян Рэспублікі Беларусь устаноўлена абавязковая і добраахвотная падрыхтоўка да ваеннай службы (мал. 46).

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки




Мал. 46. Падрыхтоўка грамадзян да ваеннай службы

Значны ўклад у падрыхтоўку моладзі да ваеннай службы ўносіць рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь» (ДТСААФ).

**Прызыўныя камісіі.** Для правядзення прызыву грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве раённымі, раённымі ў гарадах, гарадскімі (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканаўчымі і распарадчымі органамі ствараюцца прызыўныя камісіі.

Раённая (гарадская) прызыўная камісія арганізоўвае медыцынскі агляд грамадзян і прымае ў адносінах да іх пэўнае рашэнне (мал. 47).

У выпадку ўхілення грамадзян ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве раённая (гарадская) прызыўная камісія прымае рашэнне аб накіраванні адпаведных матэрыялаў у тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў па месцы жыхарства гэтых грама-

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

**РАШЭННЕ РАЁННАЙ (ГАРАДСКОЙ) ПРЫЗЫЎНОЙ КАМІСІІ**

- аб прызыве на тэрміновую ваенную службу або службу ў рэзерве
- аб замене воінскай службы на альтэрнатыўную службу
- аб адмове ў замене воінскай службы на альтэрнатыўную службу і прызыве на тэрміновую ваенную службу або службу ў рэзерве
- аб прадастаўленні адтэрміноўкі ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве
- аб вызваленні ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве і залічэнні ў запас
- аб вызваленні ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве і выключэнні з воінскага ўліку
- аб залічэнні ў запас

Мал. 47. Рашэнне раённай (гарадской) прызыўной камісіі

дзян для вырашэння пытання аб прыцягненні іх да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Для кіраўніцтва раённымі (гарадскімі) прызыўнымі камісіямі і ажыццяўлення кантролю за іх дзейнасцю абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі ствараюцца адпаведныя абласныя (Мінская гарадская) прызыўныя камісіі. Рашэнні абласной (Мінскай гарадской) прызыўной камісіі з'яўляюцца абавязковымі для ніжэйшых па рангу прызыўных камісій.

**Абавязкі грамадзян, падлеглых прызыву на ваенную службу, службу ў рэзерве, і парадак іх апавяшчэння.** Грамадзяне абавязаны атрымаць павесткі або накіраванні ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення) ці іншага органа, які ажыццяўляе воінскі ўлік, пад распіску.

Грамадзяне, падлеглыя прызыву на ваенную службу, службу ў рэзерве, абавязаны: з'яўляцца па павестках або накіраваннях у ваенны камісарыят (адасобленае падраздзяленне), на медыцынскі агляд, медыцынскае абследаванне, пасяджэнне прызыўной камісіі (да ваеннага камісара); знаходзіцца ў ваенным камісарыяце (адасобленым падраздзяленні), на прызыўным (зборным) пункце да адпраўкі іх на месца ваеннай службы, службы ў рэзерве.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

*Складзіце памятку прызыўніку пры праходжанні прыпіскі і прызыве на ваенную службу.*

Апавяшчэнне грамадзян, якія падлягаюць прызыву на ваенную службу, службу ў рэзерве, але не атрымалі павестак ці накіраванняў аб неабходнасці іх яўкі на мерапрыемствы па прызыве на ваенную службу, службу ў рэзерве, ажыццяўляецца заказным пісьмом па іх месцы жыхарства з паведамленнем аб яго ўручэнні і лічыцца належным.

Грамадзяне, якія падлягаюць прызыву і не з'явіліся на мерапрыемствы па прызыве на ваенную службу, службу ў рэзерве па павестках ці накіраваннях, абавязаны на працягу пяці рабочых дзён з дня заканчэння акалічнасцей, што перашкодзілі іх яўцы на ўказаныя мерапрыемствы, прыбыць у ваенны камісарыят (адасобленае падраздзяленне), у якім знаходзяцца на воінскім уліку, і прадставіць дакументы, якія пацвярджаюць прычыны няяўкі.

**Медыцынскі агляд і медыцынскае абследаванне грамадзян, падлеглых прызыву на ваенную службу, службу ў рэзерве.** Грамадзяне, падлеглыя прызыву на ваенную службу, службу ў рэзерве, праходзяць медыцынскі агляд урачамі-спецыялістамі.

У выпадку немагчымасці вынясення медыцынскага заключэння аб катэгорыі годнасці грамадзяніна да ваеннай службы (службы ў рэзерве) па стане здароўя пры медыцынскім аглядзе прызыўнік накіроўваецца на амбулаторнае або стацыянарнае медыцынскае абследаванне ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя для ўстанаўлення дыягназу захворвання.

**Прадастаўленне адтэрміновак і вызваленне ад прызыву.** Грамадзянам можа прадастаўляцца адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве па наступных падставах:

— па стане здароўя;

— для працягу адукацыі;

— для праходжання інтэрнатуры і здачы кваліфікацыйнага экзамену па спецыяльнасці інтэрнатуры;

— па сямейным становішчы;

— для атрымання ваенна-тэхнічных спецыяльнасцей;

— у сувязі з ажыццяўленнем дэпутацкіх паўнамоцтваў;

— на аснове ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Некаторыя катэгорыі грамадзян не падлягаюць прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, а таксама могуць быць ад яго вызвалены (мал. 48).

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

**ГРАМАДЗЯНЕ, ВЫЗВАЛЕНЫЯ АД ПРЫЗЫВУ НА ТЭРМІНОВУЮ ВАЕННУЮ СЛУЖБУ, СЛУЖБУ Ў РЭЗЕРВЕ**

- прызнаныя па стане здароўя непрыгоднымі да ваеннай службы з выключэннем з воінскага ўліку
- бацькі, маці, родныя браты ці сёстры якіх загінулі, або памерлі, або сталі інвалідамі I ці II групы ў выніку калецтва (ранення, траўмы, кантузіі), захворвання, атрыманых пры выкананні абавязкаў ваеннай службы
- якія прайшлі ваенную службу або іншым чынам выканалі воінскі абавязак у іншай дзяржаве
- з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў
- якія маюць трох і больш дзяцей

**ПРЫЗЫВУ НА ТЭРМІНОВУЮ ВАЕННУЮ СЛУЖБУ, СЛУЖБУ Ў РЭЗЕРВЕ НЕ ПАДЛЯГАЮЦЬ ГРАМАДЗЯНЕ**

- якія адбылі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчых установах
- у адносінах да якіх судом прыменены прымусовыя меры бяспекі і лячэння (на працягу тэрміну прымянення гэтых мер)
- у адносінах да якіх ажыццяўляецца крымінальнае праследаванне або крымінальная справа перададзена пракурору для накіравання ў суд ці ажыццяўляецца судовая дзейнасць
- якія маюць судзімасць

Мал. 48. Грамадзяне, вызваленыя ад прызыву на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве, а таксама грамадзяне, якія не падлягаюць прызыву

1. Што мае на ўвазе абавязковая падрыхтоўка грамадзян да ваеннай службы?
2. Што ўключае добраахвотная падрыхтоўка грамадзян да ваеннай службы?
3. Пералічыце падставы для прадастаўлення адтэрміноўкі ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве.
4. Грамадзянін А. скончыў універсітэт, маючы жонку і трох дзяцей. Ці падлягае ён прызыву на тэрміновую ваенную службу?
5. Грамадзянін А. знаходзіўся пад следствам, калі атрымаў павестку з ваенкамата аб прызыве на тэрміновую ваенную службу. Ці будзе ён прызваны на службу да заканчэння следства?

## § 11. Адміністрацыйная адказнасць за невыкананне абавязкаў прызыўніка. Крымінальная адказнасць за ўхіленне ад прызыву

*Якія віды правапарушэнняў вы ведаеце? Якія віды адказнасці за іх існуюць?*

Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь павінен свядома і адказна выконваць канстытуцыйны абавязак па абароне Айчыны.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

На жаль, не ўсе грамадзяне, якія знаходзяцца на воінскім ўліку, у сілу розных прычын ведаюць палажэнні заканадаўства і свае абавязкі, што цягне за сабой адміністрацыйную або крымінальную адказнасць.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб воінскім абавязку і воінскай службе» **воінскі ўлік** — дзяржаўная сістэма ўліку і аналізу прызыўных і ваеннаабавязаных рэсурсаў, **ваенны камісарыят** — мясцовы орган кіравання, што ажыццяўляе на тэрыторыі адной ці некалькіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак ваенна-мабілізацыйную і ўлікова-прызыўную работу.

**Адміністрацыйная адказнасць за невыкананне абавязкаў прызыўніка.** Абарона Айчыны з'яўляецца не толькі свяшчэнным доўгам, але і пачэсным абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Таму Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжвае адміністрацыйную адказнасць за невыкананне абавязкаў прызыўніка.

У выпадку няяўкі па выкліку ў ваенны камісарыят без уважлівай прычыны для прыпіскі да прызыўнога ўчастка на грамадзяніна накладаецца штраф у памеры ад дзвюх да трох базавых велічынь.

Калі ж грамадзянін паўторна не з'явіўся ў ваенны камісарыят на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, на яго накладаецца штраф у памеры ад чатырох да шасці базавых велічынь.

У выпадку парушэння грамадзянінам абавязкаў па воінскім уліку на яго накладаецца штраф у памеры ад дзвюх да трох базавых велічынь.

Акрамя гэтага, частка 3 артыкула 25.1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь прадугледжвае, што няяўка без уважлівых прычын на мерапрыемствы па прызыве на воінскую службу па павестцы ці накіраванні ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення ваеннага камісарыята) (у тым ліку няяўка грамадзяніна, які адмовіўся ад атрымання такіх павесткі ці накіравання) або ў тэрміны, вызначаныя заканадаўствам, калі дадзеная няяўка не перашкаджала прыняццю і (ці) рэалізацыі рашэння прызыўной камісіі (ваеннага камісара) аб выкананні грамадзянінам воінскага абавязку, — цягне папярэджанне ці накладанне штрафу ў памеры да пяці базавых велічынь.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

**Крымінальная адказнасць за ўхіленне ад прызыву.** Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь вызначае, якія грамадска небяспечныя дзеянні з'яўляюцца злачынствамі, замацоўвае асновы і ўмовы крымінальнай адказнасці, устанаўлівае пакаранні і іншыя меры крымінальнай адказнасці, якія могуць быць прыменены да асоб, што здзейснілі злачынствы.

Глава 36 (артыкулы 434—437) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь прадугледжвае крымінальную адказнасць прызыўнікоў, рэзервістаў і ваеннаабавязаных.

У адрозненне ад адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне абавязкаў прызыўніка, больш сур'ёзнае пакаранне чакае асоб, якія ўхіляюцца ад прызыву на ваенную службу. За дадзенае правапарушэнне прадугледжваецца ўжо крымінальная адказнасць.

У адпаведнасці з артыкулам 434 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ухіленне ад прызыву на ваенную службу па мабілізацыі або ў ваенны час караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

Згодна з часткай 1 артыкула 435 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ухіленне ад прызыву на воінскую службу караецца штрафам, арыштам ці абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Частка 2 артыкула 435 за ўхіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу, здзейсненае шляхам наўмыснага нанясення сабе цялеснага пашкоджання, сімуляцыі захворвання, падлогу дакументаў ці іншага падману, прадугледжвае пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

Згодна з часткай 1 артыкула 436 ухіленне рэзервіста або ваеннаабавязанага ад яўкі на зборы (заняткі) караецца штрафам, папраўчымі работамі на тэрмін да аднаго года або арыштам.

Частка 2 артыкула 436 за ўхіленне рэзервіста або ваеннаабавязанага ад яўкі на зборы (заняткі), здзейсненае шляхам наўмыснага нанясення сабе цялеснага пашкоджання, сімуляцыі захворвання, падлогу дакументаў ці іншага падману, прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу або арышту або абмежаванне волі на тэрмін да двух гадоў.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

У адпаведнасці з артыкулам 437 ухіленне прызыўніка ці ваеннаабавязанага ад воінскага ўліку караецца штрафам або арыштам.

Прызыўнік, рэзервіст або ваеннаабавязаны, які ўпершыню здзейсніў дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 артыкула 435, часткай 1 артыкула 436, артыкулам 437 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, могуць быць вызвалены ад крымінальнай адказнасці, калі здзейсненае з'явілася следствам збегу цяжкіх абставін.

1. Якія віды адказнасці вы ведаеце?
2. Грамадзянін А. атрымаў павестку, у якой было ўказана, у які час ён павінен з'явіцца ў ваенны камісарыят па месцы жыхарства. Аднак грамадзянін у вызначаны час не прыбыў, паколькі знаходзіўся ў бальніцы. Ці будзе грамадзянін А. прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці?
3. Якая адказнасць прадугледжана за няяўку па выкліку ў ваенны камісарыят без уважлівай прычыны?
4. Што з'яўляецца падставай для вызвалення ад крымінальнай адказнасці ў прадугледжаных Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь выпадках?
5. Ці можа няведанне заканадаўства паслужыць падставай для вызвалення ад адказнасці за невыкананне абавязкаў прызыўніка і ўхіленне ад прызыву?
6. Грамадзянін А. прадставіў у ваенны камісарыят даведку аб тым, што ён вучыцца ў вышэйшай навучальнай установе, што дало яму права на адтэрміноўку ад прызыву на ваенную службу. Праверка паказала, што даведка фальшывая. Якую адказнасць нясе ў гэтым выпадку грамадзянін А.?

## § 12. Склад і структура Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

*На якой аснове былі створаны Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь? Якая падзея лічыцца днём стварэння Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь?*

**Сучасны стан і асноўныя напрамкі далейшага развіцця беларускай арміі. Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь** — структурны элемент ваеннай арганізацыі дзяржавы, прызначаны для забеспячэння ваеннай бяспекі і ўзброенай абароны Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці, былі створаны на аснове Чырванасцяжнай БВА пасля атрымання Рэспублікай Беларусь дзяржаўнай незалежнасці. У ходзе фундаментальнага рэфармавання яны былі прыведзены ў адпаведнасць з выклікамі, рызыкамі і патэнцыйнымі пагрозамі ваеннай бяспецы дзяржавы.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки